# Віртуальная галерэя славы і гонару

Набліжаецца 75-годдзе Перамогі ў вялікай Айчыннай вайне. У Беларусі і краінах былога СССР Дзень Перамогі па праву з'яўляецца ўсеагульным святам.

Для беларускага народа памяць аб гэтай вайне незабыўная, святая. Яна напоўнена хвалюючай трагедыяй перажытага беларускім народам на шляху да Вялікай Перамогі.

У Беларусі няма ніводнай сям'і, якой так ці інакш не дакранулася б вайна, таму ў душы кожнага жыхара Беларусі, нязгадваючы на ўзрост, сацыяльнае палажэнне, рэлігійную і нацыянальную прыналежнасць зберагаецца памяць аб загінуўшых і жывых абаронцах.

Няма больш мірнай прафесіі, чым бібліятэкар, таму ва ўспамінах аб вайне служыцелі кнігі як правіла не ўпамінаюцца. Не спрабуючы перакроіць стэрэатыпы, успомнім тых, хто прысвяціў сябе высокароднай кніжнай справе, а у гады Вялікай Айчыннай вайны зрабілі ўсё магчымае для набліжэння Перамогі.

ДУК "Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя М.Багдановіча", якая ў гэтым годзе таксама адзначае свой 75-гадовы юбілей, можа ганарыцца сваімі былымі работнікамі: жанчынамі-удзельніцамі вайны, прысвяціўшымі сябе ў мірны час бібліятэчнай справе. Гэта МАСКВІЧОВА НІНА МАКАРАЎНА (франтавічка), БАБУШКІНА ГАННА МІХАЙЛАЎНА і ФІЛІПАВА КЛАРА ЛЯВОНЦЕЎНА (партызанкі). Прызваныя прыродай прадаўжаць жыццё, яны адстойвалі гэта вялікае права на мірнае неба для Радзімы.

# ФІЛІПАВА КЛАРА ЛЯВОНЦЕЎНА



Нарадзілася ў1927г.

**Клара Лявонцьеўна Філіпава** нарадзілася ў 1927 годзе ў райцэнтры Лоеў Гомельскай вобласці. У гады Вялікай Айчыннай вайны была сувязной, разведчыцай штаба партызанскай брыгады “За Радзіму”. За баявыя заслугі, мужнасць і адвагу ўзнагароджана ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі “За адвагу”, “За баявыя заслугі”, “Партызану Вялікай Айчыннай вайны II ступені”, а таксама шматлікімі юбілейнымі медалямі.

У мірны час з 1945 года яе жыццё было звязана з Маладзечанскім рэгіёнам. Працавала ў Маладзечанскім абласным радыёкамітэце (рэдактарам апошніх паведамленняў), настаўніцай Беніцкай сямігодкі, **загадчыцай Палачанскай сельскай бібліятэкі,** старшынёй Палачанскага сельскага Савета, інструктарам арганізацыйнага аддзела райкама і гаркама партыі. На працягу 22 год узначальвала Маладзечанскую фабрыку мастацкіх вырабаў, пры гэтым, 20 год паспяхова сумяшчала дырэктарскую пасаду з работай у гарадскім Савеце дэпутатаў, узначальваючы пастаянную дэпутацкую камісію

па ахове здароўя і сацыяльным забеспячэнні. За актыўную працоўную і грамадскую дзейнасць ўзнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі “За працоўную доблесць” і “За доблесную працу”.

Актыўнай жыццёвай пазіцыяй, клопатам і ўважлівымі адносінамі да людзей Клара Лявонцьеўна заслужыла павагу і аўтарытэт у маладзечанцаў. Ёй з поўным правам ў 1986 годзе прысвоена званне “Ганаровы грамадзянін горада Маладзечна”.

Нават на заслужаным адпачынку Клара Лявонцьеўна ніколі не адыходзіла ад грамадскіх спраў. Была намеснікам старшыні жаночага савета горада, стаяла ля вытокаў стварэння гарадской ветэранскай арганізацыі. На працягу больш чым 30 год з’яўляецца членам савета ветэранаў, была членам прэзідыума, намеснікам старшыні, а затым старшынёй гарадскога савета ветэранаў. З поўным правам ёй прысвоена званне “Ганаровы ветэран Беларускага грамадскага аб’яднання ветэранаў”.

Дзякуючы яе публікацыям у “Маладзечанскай газеце” і выступленнях на радыё, жыхары Маладзечаншчыны даведваюцца пра многіх дастойных удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, заслужаных людзей горада і раёна.

## МАСКВІЧОВА НІНА МАКАРАЎНА



(1923-2010)

**Ніна Макараўна Масквічова** нарадзілася 22 сакавіка 1923 года ў Полацку. Пасля заканчэння сярэдняй школы працавала старшай піянерважатай у адной з школ горада. У 1940 годзе стала студэнткай Віцебскага педінстытута. Калі пачалася вайна, была эвакуіравана ў Чалябінскую вобласць, працавала рабочай артарсенала ваеннага завода, але ўвесь гэты час імкнулася пайсці на фронт. У кастрычніку 1943 года яна - камсорг роты 36-га асобнага пражэктарнага батальёна проціпаветранай абароны Заходняга, затым Паўднёва-Заходняга франтоў.

Камсамольскім важаком Ніна Макараўна прайшла па дарогах вайны да жніўня 1945 года. За баявыя заслугі ўзнагароджана ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі “За адвагу”, “За баявыя заслугі”, “За Перамогу над Германіяй” і 19 юбілейнымі медалямі.

Пасля вайны Н М. Масквічова працавала **загадчыцай дзіцячага аддзела чытальнай залы Полацкай абласной бібліятэкі**, інструктарам аддзела прапаганды і агітацыі Полацкага ГК КПБ, вучылася **ў** Рэспубліканскай вышэйшай партыйнай школе, загадвала парткабінетам, аддзелам прапаганды і агітацыі Маладзечанскага РК КПБ. З 1969 па 1979 год працавала намеснікам старшыні Маладзечанскага райвыканкама, адкуль і пайшла на заслужаны адпачынак.

За працоўныя заслугі Н.М. Масквічова ўзнагароджана медалём “За працоўную адзнаку”, Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР, аблвыканкама, райвыканкама. **Пасля выхаду на пенсію каля 10 гадоў працавала ў раённай бібліятэчнай сістэме.**

Ніна Макараўна ўнесла вялікі ўклад у сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё нашага раёна, была прыкладам для тых, хто спадзяецца на ўласныя сілы ў дасягненні пастаўленых задач, хто сваёй настойлівай працай

і шчырымі адносінамі да людзей імкнецца заслужыць павагу.

## БАБУШКІНА ГАННА МІХАЙЛАЎНА



(1915-1990)

Дзяцінства і юнацтва **Ганны Міхайлаўны** супалі з грамадзянскай вайной і гадамі першых савецкіх пяцігодак. Яна была ўдзельніцай гарачых будняў камсамольцаў 30-х гадоў, рана зведала партыйную сталасць.

Нарадзілася Г.М.Бабушкіна ў 1915 годзе ў вёсцы Калодліва Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і. У 1932 годзе стала членам Ленінскага камсамола, у 1939 годзе ўступіла ў рады Ленінскай партыі камуністаў. Працавала загадчыцай Цімкавіцкай бібліятэкі, затым — загадчыцай дома адпачынку ў Капыльскім раёне Мінскай вобласці. З 1940 года да пачатку Вялікай Айчыннай вайны выконвала абавязкі тэхнічнага сакратара Брэсцкага гаркома партыі.

У першыя гады вайны Ганна Міхайлаўна стала інструктарам-інфарматарам Брэсцкага падпольнага ГК КПБ, затым была разведчыцай партызанскага атрада 1 Мая Першамайскай брыгады, намеснікам камісара атрада імя

Будзённага брыгады “XXV год БССР” па камсамолу (на тэрыторыі Баранавіцкай вобласці), сакратаром падпольнага Баранавіцкага гаркома камсамола. Сваёй мужнасню і адвагай пры выкананні баявых заданняў, гутаркамі з моладдзю яна ўсяляла веру ў хуткую перамогу, заклікала савецкіх людзей граміць ненавіснага ворага.

Пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў Г.М.Бабушкіна доўгі час працвала ў Баранавічах: сакратаром гаркома камсамола, намеснікам старшыні гарвыканкома. Але больш за ўсё па душы быў культурны фронт. Менавіта таму ў 1953 годзе завочна закончыла Ленінградскі бібліятэчны інстытут.

**Працавала намеснікам дырэктара гарадской бібліятэкі ў Баранавічах, загадчыцай раённай бібліятэкі ў Нясвіжы, метадыстам абласной бібліятэкі ў Магілёве.**

З 1957 года Ганна Міхайлаўна Бабушкіна жыла і **працавала ў Маладзечна: бібліятэкарам, загадчыцай аддзела абслугоўвання абласной бібліятэкі, загадчыцай гарадской дзіцячай бібліятэкі,** дырэктарам кінатэатра «Радзіма». **бібліятэкарам гарадской бібліятэкі.** Г. М. Бабушкіна прымала актыўны ўдзел у грамадскім жыцці; часта выступала перад моладдзю і школьнікамі, вяла актыўную ваенна-патрыятычную работу па выхаванню падрастаючага пакалення.

На ўсіх участках работы Г.М.Бабушкіну вызначалі адданасць справе, высокая адказнасць, чуласць і блізкасць да людзей. |

Радзіма высока ацаніла заслугі Г.М.Бабушкінай. Яна ўзнагароджана ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны II-й ступені, шматлікімі медалямі.

ЛІТАРАТУРА:


1.Аб самым галоўным // Маладзечанская газета. – 2006. – 6 студзеня. – С.3.
2.Алексейчик,О. Дорога от домика с белыми крыльями / Ольга Алексейчик // Мінская праўда. – 2005. – 10 мая. – С. 2.
3. Бабушкина,А.М. Нас водила молодость /А.М.Бабушкина // Знамя коммунизма. – 1980. – 24 сентября.
4. Бабушкина,А.М. Тех дней не смолкнет слава //За край родной: воспоминания партизан и подпольщиков Барановичской области. – Мн., 1978. – С. 231-236.
5. Г.М. Бабушкіна: некралог //Святло камунізму. – 1990. – 29 чэрвеня.
6 Давідовіч.Р. Шчодры лёс / Раіса Давідовіч // Маладзечанская газета.- 2010. - 8 мая.- С.5.
7.Долготович, Б. Филиппова Клара Леонтьевна / Б. Долготович // Почётные граждане белорусских городов.- Минск :"Беларусь", 2008. - С. 295.
8. З юбілеем!: К.Л. Філіпава //Маладзечанская газета. – 2007. – 4 красавіка. – С. 3.
9. Крупянькова, А. Мы ўдзячны вам, Ніна Макараўна / Анжаліка Крупянькова // Маладзечанская газета.- 2008. - 22 сакавіка.- С. 3.
10. Лазоўскі, А. Гэта шчасце - служыць людзям / А. Лазоўскі // Маладзечанская газета.- 2011. - 5 сакавіка.- С. 4.
11. Міхайлаў,Я. Героі кніг – жыхары нашага горада / Я. Міхайлаў // Святло камунізму. – 1975. – 5 лютага. – С. 3.
12. Нёманскі,М. Выпрабаванне /Текст/ /М.Нёманскі //Святло камунізму. – 1975. – 19 ліпеня. – С. 1.

13. Ні мінуты спакою : 4 красавіка ветэран ВАВ, ганаровая грамадзянка Маладзечанскага раёна К.Л. Філіпава адзначае сваё 90-годдзе. // Маладзечанская газета. - 2017. - 1 красавіка. - С. 5.
14. Обеспечение партизанских операций // Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны. В 3 т. Т.2. - Мн.,1984. – С. 257.
15. Пакінуць добры след /падрыхтавала Кацярына Місевіч // Маладзечанская газета. – 2006. – 20 верасня. – С. 3.
16. Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Маладзечна і Маладзечанскага раёна / Рэдакцыйная калегія: Г.П.Пашкоў (галоўны рэдактар) і інш.; укладальнік Л.Карповіч. – Мн.: БелЭн, 2002. – 792 с.:іл.
17. Проба агнём // Філіпава,К.Л.Жывым – помніць... / К.Л.Філіпава – Маладзечна, 2009. – С. 12-18.
18. Филипова Клара Леотьевна // Матери Минщины: справочное издание. – Мн., 2006. – С. 110-111.
19. Філіпава Клара Лявонцеўна // Ганаровые грамадзяне горада Маладзечна - Маладзечна: Цэнтральная гарадская бібліятэка імя М.Багдановіча; сектар інфармацыі, 2003. – С. 54-57.
20. Філіпава, К. Гэта наша з табой біяграфія / Клара Філіпава // Маладзечанская газета.- 2010. - 22 верасня.- С.5.
21. Філіпава, К.Л. Жывым - помніць... / К.Л.Філіпава ; [прадмова: С.У.Зубкова, А.А.Хазянін]. - Маладзечна : Друк. "Перамога", 2009. - 277,[3]с.
22. Філіпава, К.Л. Проба агнём / К.Л. Філіпава // Жывым помніць.- Маладзечна: Друк. “Перамога”, 2009.- С. 12-18.

23. Філіпава, К. Якое шчасце - быць патрэбнай людзям! / Клара Філіпава // Маладзечанская газета.- 2009. - 11 лістапада.- С. 5.
24. Цар,Л. "Шчасце - служыць людзям" : Ганаровыя грамадзяне - аб родным горадзе. Праект "МГ" / Людміла Цар // Маладзечанская газета. - 2018. - 30 чэрвеня. - С. 4.